привлечению к ответственности за разрушение памятников, занесенных в госреестр архитектурного наследия. И если не принимать никаких попыток по устранению этой проблемы – есть риск того, что наши потомки не смогут увидеть и половины того, что сохранилось до сегодняшних дней. Так, с целью сохранения историко-культурного наследия Беларуси, была принята и утверждена государственная программа «Замки Беларуси» на 2012–2018 гг., которая направлена на улучшение современного состояния памятников Беларуси.

1. Ткачев, М.А. Замки Беларуси / М.А. Ткачев. – Минск : Беларусь, 2007. – 200 с.

2. Ткачоў, М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст / М.А. Ткачоў. – Мінск : Полымя, 1986 – 240 с.

3. Чантурия, В.А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В.А. Чантурия. – Минск : Полымя, 1986 – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ждан Н.А.,** студ. 219 гр.
Навуковы кіраўнік – Войцік С.Ф.

## АСАБЛІВАСЦІ СЦЭНІЧНАГА ЎВАСАБЛЕННЯ АБРАДА «ГУКАННЕ ВЯСНЫ» Ў ДЗІЦЯЧЫМ АНСАМБЛІ НАРОДНАЙ ПЕСНІ «СЕНІЧКА»

Нашым продкам поры года ўяўлялі як жывыя багі і багіні, якія па чарзе прыходзяць на зямлю і ўладараць над ёй пэўны тэрмін. Вясну яны называлі дзяўчынай гожай і добрай, лета – малойцам прыгожым і багатым, восень – жанчынай багатай і шматдзетнай, а зіму – бязлітаснай мачахай. Дзякуючы такім уяўленням, на працягу многіх вякоў складаўся адзіны каляндарна-

земляробчы цыкл абрадаў і песень, куды ўваходзілі больш дробныя цыклы, адпавядаючыя порам года. Сярод іх адным з самых цікавых і найважнейшых быў цыкл веснавых святаў. Якія ж абрады ўтваралі веснавы цыкл? На Беларусі туды ўваходзілі: закліканне вясны, велікдзень, юр'я, ваджэнне і пахаванне стралы,троіца, русальны тыдзень.

Першым веснавым святам было гуканне вясны. Яно звязана не толькі з абуджэннем стваральных сіл прыроды, але і з абуджэннем надзей чалавека, які цалкам залежаў ад яе. Прыход вясны чакаўся з асаблівым пачуццём, сустрэча яе абстаўлялася вельмі ўрачыста. Гэты перыяд насычаны абрадавымі дзеяннямі, якія суправаджаліся адпаведнымі заклікамі, заклінаннямі, песнямі, гульнявымі момантамі.

Месцамі правядзення абрада «Гуканне вясны» былі: узгорак, высокі бераг ракі, возера; страха пуні, гумна, лазні ці паляна на якой павінна было расці дрэва( дуб, сасна, бяроза), вакол якога вадзілі карагоды. Месца дзеяння не было выпадковым. Яно звязана з імкненнем узмацніць эфект воклічу, які быў характэрны для гэтага абраду. Самымі актыўнымі ўдзельнікамі свята былі дзяўчаты, хлопцы, радзей- прадстаўнікі старэйшага пакалення, дзеці.

Амплітуда ваганняў часавой прымеркаванасці была даволі значнай – ад Масленіцы да другога дня Вялікадня. 1 сакавіка (на Еўдакію), 9 сакавіка (на саракі) і 25 сакавіка (на Благавешчанне).

Я вырашыла паспрабаваць ўвасобіць абрад «Гуканне вясны», які праводзіўся 9 сакавіка па старому стылю, 22 сакавіка па новаму (на саракі) ў дзіцячы ансамбль народнай песні. У язычніцкай традыцыі ў гэты час прыляталі 40 выраяў птушак. А таксама у гэты дзень зіма канчаецца – вясна пачынаецца, дзень з ноччу мераецца. Гэта дзень вясновага раўнадзенства.

Падчас правядзення абраду выкарыстоўвалі шэраг атрыбутаў: упрыгожаную кветкамі і рознакаляровымі стужкамі бярозку, драўлянае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасмаленае кола, вянкі з бярозавых галінак, выпечаныя з цеста або зробленыя з гліны «птушак».

Перш за ўсё неабходна было вызначыць:

Тэмы абраду загукання вясны:

1. Тэма сонца або салярныя культы (ад лат. solaris – «сонечны») – гэта сістэма знакаў (сустракаецца у вышыўцы на касцюме, рушніках, паясах, на франтонах жылля) і дзеянняў (у карагодах які водзяцца па сонцу, выклічках-зварот да сонца, паленнях вогнішчу), звязаных з пакланеннем свяціле.

2. Тэма вясны (як і тэма сонца, зараджэнне ўсяго новага).

3.Тэма хлеба і адносін беларускага селяніна да яго («хлеб – усяму галава», «у полі капамі – на стале пірагамі»). Выходзілі гукаць вясну з караваем (Петрыкаўскі раён), а таксама прыносілі ахвяру зямлі, закопваючы ў зямлю гаршчок кашы.

4. Тэма птушак, як сімвалаў вясны і дабра.

5. Тэма кахання.

Абрад будаваўся ў вызначаным парадку:

1. Падрыхтоўка да свята, у якую уваходзілі наступныя дзеянні:

а) адна група удзельнікаў выпякала ў печы або выраблява з гліны, дрэва, паперы «птушак».

б) другая група упрыгожвала елачку стужкамі і папяровымі кветкамі.

в) трэцяя група складала сталага веку жанчын, якія рыхтавалі пудзіла зімы.

2. Збор ўдзельнікаў.

3. Абыход двароў.

На Міншчыне зафіксаваны абход хат са спевамі, гуканнем вясны і затанцоўваннем яе. Гурт молодзі ішоў у канец вёскі і па чарзе ля кожнага двара вадзіў карагод «Дзе карагод ходзіць, там жыта родзіць».

4. Прыход на ўзгорак ці паляну, дзе будзе праходзіць свята:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а) працяг ваджэння карагодаў і правядзенне разнастайных гульняў. Напрыклад «Ляда»;

б) гушканне на арэлях.

в) ушанаванне бярозы.

5. Раскладванне вогнішча і спальванне смецця, якое набралася за зіму; ваджэнне карагодаў па кругу; ахвяраванне рацэ.

6. Фінал. Канец абрада.

У канцы святкавання удзельнікі рабілі жывы калідор і гулялі у «Ручаёк» ці «Вароты». Потым тры хлопчыка бралі пудзіла, і кідалі ў агонь. Пасля выканання абраду абавязковым было спажыванне рытуальных страў: прасяной і ячнай каш, яек, «галушак», журавінага квасу.

Музычная частка абраду.

У песнях абрада «Гуканне вясны» вылучаюцца 2 групы: песні-гуканні і песні карагодна-гульнявыя.

I. Песні-гуканні. Розныя па зместу і форме. Сярод іх вылучаюцца песні:

а) з магічна-заклінальнымі інтанацыямі. Для іх характэрна мелодыя, пабудаваная на двух-трох гуках і паўтарэнне адной і той жа інтанацыыі.

б) песні-звароты да маці, старых людзей з просьбай дазволіць вясну гукаць. Такія звароты паказваюць на старажытнае паходжанне песень, калі любое жаданне ці дзеянне не пачыналася без дазволу старэйшын роду. Напрыклад: «Ці дазволіце старыя людзі(дзяды)», «Благаславі, маці».

в) пазнейшае прымеркаванне –звароты да Бога, Прачыстай: «Благаславі маці (Прачыстая)», «Да памажы Божа», але хрысціянізаваны зварот не змяніў ўнутранага зместу гукання.

г) у многіх вяснанках пачэсны абавязак адмыкання цяпла і лецечка выконваюць птушкі і пчолкі. Напрыклад: «Жавароначкі прыляціце» і «Ты пчолачка ярая».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

II. Карагодна –гульнявыя песні. Яны падзяляюцца на тры вялікія групы:

1. Лірычныя песні-карагоды. Іх тэксты не разыгрываюцца.Маюць нескладаны харэаграфічны малюнак і простыя рухі (звычайны крок, «пераменны», з рухам ў бок). Малюнак карагода – кола, ланцужок, змейка, ручаёк, сценка на сценку, зорачка.

2. Гульнявыя песні-карагоды. Тэксты песень разыгрываюцца. Гульнявыя карагоды пабудаваны на пэўным дзеянні з вылучэннем салістаў або груп. Песні маюць дыялагічную форму,сюжэтную інтрыгу. Яскравы прыклады – карагод «Перапёлачка».

3. Танцавальныя песні-крагоды. Не так важны змест песень, як іх рытміка. Яны бываюць павольныя і хуткія з даволі складаным харэаграфічным малюнкам. Ён уяўляе сабой камбінацыю розных фігур («спіраль», «вароты», «матылёк» і інш.). Напрыклад: «Вясна-красна, што ты нам прынясла?», «Вісна, дзе бувала?».

Асаблівасці і складанасці правядзення абраду на сцэне ў дзіцячым ансамблі.

1. Рэжысёрска-сцэнічныя:

а) Абмежаванасць на сцэне, дзе праходзіць абрад, у адрозненні ад правядзення на прасторы, вуліцы;

б) Наяўнасць удзельнікаў рознага ўзросту ў традыцыйным абрадзе, і толькі дзіцячы калектыў на сцэне;

в) Немагчымасць паказу на сцэне важнага моманту абраду -- абыход двароў;

г) Увасабленне на сцэне важных момантаў, характэрных для гэтага абраду: гушканне на арэлях, ахвяраванне рацэ, развядзенне вогнішча і спальванне пудзіла;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

д) танцавальна-харэаграфічныя складанасці пры падрыхтоўцы нумароў;

е)выбар галоўных герояў і праца з дзецьмі над сцэнічным вобразам.

2. Музычныя складанасці:

а) Выкананне заклічак у народнай манеры.

Песні-гуканні вясны з'яўляюцца найбольш прыгожай, але выключна складанай для выканання. Найлепшы сродак іх засваення – ад носьбітаў гэтай песеннай традыцыі, а пры немагчымасці – з запісаў. б) Адбор музычнага матэрыялу.

Прааналізаваўшы музычна-песенны матэрыял, мы высветлі, што найбольш цікавыя ўзоры адрозніваюцца:

складанай інтанацыяй;

метрарытмічным малюнкам;

разнастайным танальным планам;

наяўнасцю вялікай колькасці ўпрыгожванняў (фаршлагаў, мардэнтаў, спяванне дробных працягласцяў на адным складзе).

Таму, выходзячы з магчымасцяў майго ансамбля патрэбна было адабраць песні самыя зручныя для выканання і простыя для дзіцячага разумення. Напрыклад: «Вясна-вясна на калочку», «Жавароначкі прыляціце», «Вясна-красна наставала».

Абрад – гэта традыцыйнае дзейства, якое выразна рэгламентавана і не дапускае недакладнасцяў, адвольнага тлумачэння. Яго канструкцыя патрабуе вывучэння і асцярожнага дачынення да шматвекавога вопыту нашых продкаў. У сваёй працы я пастаралася улічыць гэтыя моманты.

---

1. Барташэвіч Г.А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 185 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Беларуская міфалогія: энцыклапед. слоўн./ С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап.– Мінск : Беларусь, 2006.–599 с.

3. Беларускія народныя абрады / склад., навук.рэд. і прадм. Л.П. Касцюкавец. – Мінск : Беларусь, 1994. – 128 с.

4. Веснавыя песні / [Складальнікі: Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей; складальнік муз. часткі В.І. Ялатаў; рэд. тома К.П. Кабашнікаў].– Мінск : Навука і тэхніка, 1979.– 608 с.

5. Катовіч, А., Крук Я. Веснавыя святы: нарысы : у 2 кн. Кн.1 / А.В. Катовіч, Я. Крук; маст. У.У. Васюк, А.Л. Баранаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – 359 с.

**Жданова Е.А.,** студ. 420 э гр.
Научный руководитель – Карчевская Н.В.

# АНАЛИЗ ТВОРЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ БАЛЕТА МОЛОДЁЖНОГО ТЕАТРА ЭСТРАДЫ

За свой не столь долгий творческий путь Молодежный театр эстрады успел полюбиться жителям столицы и превратиться в одно из любимых мест проведения досуга. История Молодежного театра эстрады началась в 1997 г., когда в городе появился необычный театр, репертуар которого состоял в первую очередь из концертных программ различных жанров и направлений. Первый художественный руководитель театра, заслуженный артист Республики Беларусь Олег Тиунов, изначально ориентировал свой творческий коллектив на то, чтобы программы были построены не только на классическом, но и на современном музыкальном материале [3]. Это происходит благодаря замечательному творческому коллективу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ